**С.А. Паўлава,** *дацэнт*

# АРГАНІЗАЦЫЯ І СТЫМУЛЯВАННЕ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ
(бібліятэказнаўчыя дысцыпліны)

Навуковым супольніцтвам прапануецца такое кіраванне самастойнай работай студэнтаў, якое здольна забяспечыць "жыццёвасць" ведаў, развіццё здольнасцей і талентаў кожнага студэнта, што вядзе да павышэння якасці адукацыі. Ідэя стымулявання самастойнай работы студэнтаў звязваецца псіхолагамі з матывацыяй.

Даследаванне ў сферы кіравання самастойнай работай студэнтаў ідзе ў трох кірунках:

– вывучаюцца агульныя ўмовы і метады развіцця ў студэнтаў уменняў разумовай працы і навыкаў самастойнай работы з кнігай у лабараторных умовах;

– даследуюцца формы ўзаемадзеяння выкладчыка і студэнтаў;

– распрацоўваюцца пытанні агульнай тэорыі метадаў навучання з выкарыстаннем самастойнай работы студэнтаў.

Увага навукоўцаў сканцэнтравана на высвятленні спецыфічных асаблівасцей пазнавальнай дзейнасці, якія з'яўляюцца фундаментам самастойнай работы.

Арганізацыя кіруемага самастойнага навучання патрабуе глыбокага псіхалагічнага забеспячэння. Таму, улічваючы асаблівасці аб'екта кіравання, важна рэалізацыя наступных прынцыпаў педагагічнага ўзаемадзеяння:

– *дыялагізацыя* – ролевая сацыяльная і міжасобасная ўзаемасувязь выкладчыка і студэнта. Дадзены прынцып рэалізуецца праз педагагічнае раўнапраўнае ўзаемадзеянне на ўзроўні абмену інфармацыяй;

– *праблематызацыя* – змяненне ролі і функцый выкладчыка і студэнта, заахвочванне студэнта да даследчай дзейнасці шляхам актуалізацыі ўмоў;

– *індывідуалізацыя* – змяненне педагагічнага ўзаемадзеяння з улікам інтэлектуальнага патэнцыялу, здольнасцей, схільнасцей навучэнцаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– *персаніфікацыя* – уключэнне ў педагагічнае ўзаемадзеянне такіх пачуццяў, эмоцый і ўчынкаў, якія адпавядаюць жыццёвым планам студэнта, яго ролеваму чаканню.

Да агульных функцый кіравання самастойнай работай адносяцца планаванне, арганізацыя, кантроль, матывацыя.

*Планаванне* – гэта перш за ўсё выпрацоўка і прыняцце рашэнняў, якія б дазволілі дасягнуць максімальнага эфекту ад самастойнай работы. Кожны выкладчык на падрыхтоўчым этапе прадумвае ўсю лагічную сістэму арганізацыі самастойнай работы (складанне рабочых праграм з вылучэннем тэм для кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычных комплексаў і інш.). Адзначым, што некаторыя выкладчыкі сталі планаваць вялікія аб'ёмы самастойных заданняў і шмат кантрольных мерапрыемстваў. Гэта можа прывесці да таго, што студэнты будуць фармальна ставіцца да іх выканання. Пры планаванні самастойнай работы неабходна выкарыстоўваць сучасныя метады – аналітычны і нарматыўны, якія дазваляюць высвеціць сапраўдны стан самастойнай работы і выпрацаваць нормы яе ацэнкі.

Калі гаварыць аб *арганізацыі* самастойнай работы, неабходна ўлічваць, што, з аднаго боку, – гэта арганізацыя адпаведнай дзейнасці выкладчыкаў, з другога – арганізацыя дзейнасці студэнтаў, занятых самастойнай работай.

Самастойная работа цесна ўзаемазвязана з самаадукацыяй і інфармацыйнай культурай. Устаноўлена, што паняцце "самастойная работа" знаходзіцца ў іерархічнай падпарадкаванасці адносна самаадукацыі, паколькі з'яўляецца сродкам, а таксама псіхалагічнай і тэхналагічнай асновай удасканалення самаадукацыі, больш складанага псіхолага-педагагічнага ўтварэння, дзе адсутнічае адзін з важкіх матывацыйных стымулаў – кантроль самастойнай працы. Самастойную работу ў ВНУ таксама неабходна лічыць асноўным фактарам фарміравання інфармацыйнай культуры спецыяліста. Пры выкладанні дысцыплін бібліятэказнаўчага цыкла пэўную нагрузку ў раскрыцці гэтага аспекту самастойнай работы павінен выконваць курс "Уводзіны ў спецыяльнасць". У змесце дадзенага вучэбнага прадмета дыферэнцыравана і структурна прадстаўлены ўзроўневы змест самастойнай работы ў выглядзе блокаў:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– арганізацыі і планавання студэнтам сваёй самастойнай работы;
– работы з крыніцамі інфармацыі;
– інтэлектуальнай апрацоўкі інфармацыі.

На лекцыях па ўсіх дысцыплінах выкладчыкі рэкамендуюць студэнтам літаратуру і тлумачаць метады работы з дапаможнікамі і першакрыніцамі. У гэтым плане асаблівыя магчымасці маюць уводныя і ўстановачныя лекцыі, на якіх раскрываюцца праблематыка тэмы, логіка авалодання ёю, даецца характарыстыка спіса літаратуры, вылучаюцца раздзелы для самастойнай адпрацоўкі.

Семінарскія заняткі разлічаны на ўдасканаленне ўменняў пошуку аптымальных варыянтаў адказаў, рашэнняў.

Самастойная работа выконваецца з выкарыстаннем апорных дыдактычных матэрыялаў, якія карэкціруюць работу студэнтаў і ўдасканальваюць яе якасць. Трэба адзначыць сінкрэтызм арганізацыйных і дыдактычных элементаў, што сведчыць аб нераспрацаванасці гэтых бакоў самастойнай работы.

Арганізацыя навучання павінна быць забяспечана вучэбна-метадычнымі матэрыяламі. На кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы створаны наступныя дапаможнікі: вучэбна-метадычныя комплексы як на папяровых, так і на электронных носьбітах, тэксты лекцый, дыдактычныя матэрыялы. Вучэбна-метадычныя комплексы распрацаваны з улікам усіх структурных частак і з'яўляюцца базай для работы па модульна-рэйтынгавай сістэме. Модульная сістэма прымушае студэнтаў рэгуляваць вучэбную работу, і перш за ўсё самастойную, павышае зацікаўленасць у яе выніках.

Заданні для самастойнай работы распрацаваны адпаведна тром узроўням самастойнай работы:

1) *рэпрадукцыйны* (трэніровачны) – гэта работы, якія выконваюцца па ўзоры: запаўненне табліц, разбор сітуацый, складанне тэзаўруса. Пазнавальная дзейнасць студэнта праяўляецца ў асэнсаванні, запамінанні матэрыялу. Мэта такіх работ – замацаванне ведаў, фарміраванне ўменняў, навыкаў;

2) *рэканструкцыйны* – пры выкананні такіх работ адбываюцца перабудова рашэнняў, складанне плана, тэзісаў, анатаванне. На гэтым узроўні выконваецца рэферат. У апошні час мы пачалі

паступова адмаўляцца ад гэтай формы і прапаноўваць творчыя заданні;

3) *творчы* – гэта работы, якія патрабуюць аналізу праблемнай сітуацыі, пошуку новай інфармацыі. Такія заданні носяць вучэбна-даследчы характар. Прыкладам можа быць правядзенне спецсемінара па дысцыпліне спецыялізацыі "PR і рэклама бібліятэкі". Семінар праводзіўся на базе Нацыянальнай бібліятэкі, падрабязна методыка правядзення апісана на старонках часопіса "Бібліятэчны свет".

Павышэнне пазнавальнай актыўнасці, эфектыўнасці самастойнай работы залежыць не толькі ад арганізацыі вучэбнага працэсу, але і ад *кантролю*, разнастайнасці яго формаў (тэсціраванне, залікі, экзамены, індывідуальныя гутаркі і кансультацыі з выкладчыкам, праверкі пісьмовых работ і інш.). Важнае значэнне мае матывацыйны фактар кантролю. Адлюстраванне ў рэйтынгавай сістэме паказчыкаў бягучай паспяховасці, іх улік на заліках і экзаменах стымулююць студэнтаў да самастойнай працы.

На кафедры пастаянна вядзецца работа па аналізу і пошуку новых метадаў навучання, матывацыі для іх далейшага ўкаранення ў вучэбны працэс. Так, у мінулым навучальным годзе была апрабіравана тэхналогія праектнага навучання (курс "Бібліятэчны менеджмент"). Тэхналогія праектнага навучання арыентавана не толькі на інтэграцыю фактычных ведаў, але і на іх выкарыстанне і набыццё новых, яна садзейнічае *матывацыі* студэнтаў да вучэння. У працэсе падрыхтоўкі і выканання праекта ў студэнтаў фарміруецца ўяўленне аб сваіх магчымасцях і ўменнях іх рэалізаваць. Яны вучацца праграміраваць сваю дзейнасць, выбіраць неабходныя сродкі для дасягнення мэты, вызначаць паслядоўнасць сваіх дзеянняў, ацэньваць вынікі, самастойна карэкціраваць свае дзеянні такім чынам, каб канчатковы вынік адпавядаў пастаўленым мэтам.

Выкананне праекта арыентавана на самастойную дзейнасць студэнтаў (індывідуальную, парную, групавую), якую студэнты выконваюць на працягу вызначанага часу. Метад праектаў заўсёды прадугледжвае рашэнне якой-небудзь праблемы. Рашэнне гэтай праблемы цягне за сабой, з аднаго боку, выкарыстанне разнастайных метадаў, сродкаў, а з другога – інтэграванне ведаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

уменняў, набытых пры вывучэнні розных дысцыплін. Вынікі выкананых заданняў павінны быць адчувальнымі. Гэта можа быць, напрыклад, канкрэтны праект, гатовы да ўкаранення.

Для самаацэнкі і ацэнкі вынікаў работы студэнтаў над праектам выкарыстоўваем рэйтынгавую сістэму. Для гэтага ў пачатку работы для кожнага ўдзельніка падрыхтавана табліца "Паказчыкі эфектыўнасці дзейнасці студэнта", якая запаўняецца студэнтам па ходу выканання праекта.

Калі студэнт выконвае заданне, вынікі якога ў далейшым могуць быць выкарыстаны ў вучэбным працэсе, навуковым даследаванні ці могуць быць апублікаваны, калі работа выконваецца па заказе бібліятэкі, гэта, безумоўна, з'яўляецца добрым стымулам для актыўнай і якаснай работы.

Цікавасць студэнтаў да сучасных тэхналогій вялікая, і яе неабходна выкарыстоўваць. Сёння камп'ютэр – важны сродак і навучання, і кантролю. Ён дазваляе актыўна рашаць такія, напрыклад, актуальныя задачы, як назапашванне і выкарыстанне сучасных наглядных і даведачных матэрыялаў: баз даных, фатаграфій, відэафільмаў, у тым ліку з запісам асобных мерапрыемстваў.

Эфектыўнасць сучасных тэхналогій выяўляецца ў змяненні не столькі аб'ёму вучэбнай работы, колькі якаснага ўзроўню ведаў студэнтаў, іх зацікаўленасці ў навучанні спецыяльнасці, у набыцці ўменняў правільна асэнсоўваць вучэбныя задачы і прымаць эфектыўныя рашэнні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Н.Е. Петушко,** *доцент*

## ОРГАНИЗАЦИЯ САМОСТОЯТЕЛЬНОЙ РАБОТЫ В УЧЕБНОМ ПРОЦЕССЕ

(факультет информационно-документных коммуникаций, по данным анкетирования)

За последние годы в научно-методической литературе нашли отражение различные аспекты управляемой самостоятельной работы: ее сущность, формы и виды, соотношение между самостоя-